6. Ishiyama, John. Ethnopolitical Parties and Democratic Consolidation in Post-Communist Eastern Europe // Nationalism & Ethnic Politics, № 7, 2001, pp. 25–45.
7. Lijphart, Arend. Electoral Systems and Party Systems: A Study of Twenty-Seven Democracies, 1945−1990 // Oxford: Oxford University Press, 1994.
8. Norris, Pippa. Ballots not Bullets: Testing Consociational theories of Ethnic Conflict, Electoral Systems, and Democratization // In Andrew Reynolds (ed). The Architecture of Democracy: Constitutional Design, Conflict Management, and Democracy. Oxford: Oxford University Press, 2002, pp. 206–247.
9. Reilly, Ben. Democracy in Divided Societies: Electoral Engineering for Conflict Management // Cambridge: Cambridge University Press, 2001.

## АГУЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ АФАРМЛЕННЯ ПАЛЕСКІХ ЗАКЛАДНЫХ РУЧНІКОЎ НА БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІМ ПАМЕЖЖЫ

**Кляпоўская А.А.,**
*ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Беларуска-ўкраінскае памежжа з'яўляецца зонай этнакультурных кантактаў, якая ўмоўна вызначана раёнамі адзінага геаграфічнага арэала Палесся ў басейне ракі Прыпяць, дзе ў канцы XIX – першай палове XX ст. быў распаўсюджаны тып узорнага ручніка ў тэхніцы закладнога ткацтва, пад агульнай назвай «завеска» – дэкаратыўнага і сакральнага прызначэння для ўпрыгожвання абразоў. Палескі арэал бытавання закладных ручнікоў падзелены дзяржаўнай мяжой паміж Беларуссю і Украінай. На Беларусі ўжыванне гэтай тэхнікі ткацтва для ўпрыгожвання тэкстыльных прадметаў народнага касцюма і ручнікоў было распаўсюджана ў зоне Усходняга Палесся: Столінскі, Ганцавіцкі раёны Брэсцкай вобласці, Лоеўскі, Лельчыцкі, Жыткавіцкі, Мазырскі, Брагінскі, Ельскі, Нараўлянскі раёны Гомельскай вобласці і Сярэдняга Падняпроўя: Рагачоўскі, Чачэрскі, Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі раёны Гомельскай вобласці [4, с. 207]. А на Украіне закладныя ручнікі існавалі на тэрыторыі Сярэдняга Палесся: Оўруцкі, Народыцкі, Алэўскі, Малінскі, Радамышльскі, Корасценскі, Лугінскі, Наваград-Валынскі раёны Житомірскай вобласці, Чарнобыльскі, Палескі, Іванкоўскі, Макароўскі, Барадзянскі, Вышгарадцкі раёны Кіеўскай вобласці, у некаторых раёнах Ровенскай вобласці, Чарнігаўшчыне [1; 3; 5].

Экспедыцыі беларускіх і ўкраінскіх навукоўцаў выявілі ў Чарнобыльскай зоне значную колькасць узораў ручнікоў у тэхніцы закладнога ткацтва. Традыцыі закладных ручнікоў і іх арнаментальныя матывы вывучалі беларускія навукоўцы В. Лабачэўская [4], Г. Нячаева [2],

Рэпазіторый ВДУ

а ўкраінскі – Л. Булгакава [21], Р. Захарчук-Чугай [3], Л. Арол [5], С. Сыдаровіч [6] і др.

Мэта даследавання – выяўленне агульных мастацкіх традыцый афармлення палескіх ручнікоў у тэхніцы закладнога ткацтва на беларуска-ўкраінскім памежжы.

Закладное ткацтва – адна з самых старажытных тэхнік узорнага ткацтва, якая выкарыстоўвалася ў Вавілоне, Кітаі, Асірыі, Персіі, Старажытным Егіпце, у балгараў, фінаў Паволжа, паўднёвых велікарусаў, народаў Сярэдняй Азіі і цюркамоўных народаў Усходняй Еўропы. У этнаграфічнай беларускай і ўкраінскай літаратуры адзначана, што на сумежных тэрыторыях Беларусі з Украінай падобныя закладныя ручнікі па кампазіцыі і арнаменце носяць назву «кілімавыя ручнікі», што паказвае на іх узаемасувязь з дывановым ткацтвам [4, с. 216; 6, с. 15–16]. Многія даследчыкі не выключалі таго, што тэхніка была занесеная старажытнымі ўсходнімі качавымі цюркскімі народамі ў стэпавыя раены Украіны, а потым – на ўсходнія рубяжы Беларусі [2, с. 183]. Кіеўская Русь запазычала спосаб тэкстыльнай арнаментацыі ў закладной тэхніцы ад Візантыі. Украінскія даследчыкі адзначаюць, што дыван («ковъръ») згадваецца ў летапісах X–XII стагоддзяў (Лаўрэнцьеўскага летапісу 977 года), дзе іх выкарыстоўвалі ў пахавальным абрадзе князёў [5, с. 47]. Тэхніка закладнога ткацтва была перанятая казацкай культурай (XV–XVI стст.), якое было тым сацыяльным пластам насельніцтва, што фармаваў попыт на імпартныя кілімы ўсходняга паходжання. Асноўнае фарміраванне на Беларусі і Украіне ўзорных ручнікоў у тэхніцы закладнога ткацтва адносіцца да XVII–XIX стст., якія склаліся пад уплывам імпартаваных дываноў з краін Усходу, іх мануфактурнай вытворчасці на тэрыторыі беларуска-ўкраінскага памежжа, Кралявецкага промыслу на Сумшчыне Украіны [4, с. 217; 6, с. 44–46].

На беларуска-ўкраінскім памежжы Палесся ў канцы XIX – першай палове XX ст. ручніковыя палотны, вытканыя закладной тэхнікай, былі не шырокія (вузкія) – 35 см, але доўгія – 300–600 см. На Беларусі такія ручнікі называлі: «набразнікі», «абразны ручнік», «накутнікі», «набожныя платкі», «закладныя набожнікі»; а на Украіне – «завєски», «занавеси», «завіски», «в пераклад», «покутники»,«образники», «божники», «набожники», «горінкові рушники», «красні» – святочныя ручнікі або «закладні» (веска Ласкы Народыцкага раёна Жытомірскай вобласці) [3, с. 299]. Для іх характэрна агульная кампазіцыя, якая складвалася з прылеглых адзін да аднаго графічна выразных арнаментальных бардзюраў рознай шырыні і чаргавання [1, с. 333]. Гарызантальныя паласы ўвасаблялі семантыку парадку і мяжы, несучы ў сабе вобраз разоры зямлі, пачатку і канца, абумоўленую дзейнасцю палешукоў – земляробствам. Папярочнае размяшчэнне бардзюраў звязана і з самой тэхналогіяй ткацкага рамяства. Для арнаменту закладных ручнікоў характэрныя ўзбуйненыя



Рэпазіторый ВДУ

простыя геаметрычныя элементы і выяўленчыя матывы ў бардзюрах або яны размяшчаліся ў шахматным парадку. У бардзюрных кампазіцыях ручнікоў чаргуюцца белафонавыя і чырвонафонавыя ўзорныя палосы з простымі (ромбы, прамавугольнікі,трохкутнікі, радкі, кропкі, рысачкі, хвалі-зігзагі, прыступкавыя слупкі, стрэлы), і больш складанымі матывамі (геаметрычныя ромбы, крыжападобныя фігуры і ўзоры, ромба-геаметрычныя матывы, васьмікутныя разеткі, зоркі), цэнтрычныя кампазіцыі з геаметрызаванымі манументальнымі фігурамі (вазоны, трохсвечнікі, «дрэва жыцця»), часам схематызаваныя выявы птушак або двухгаловага арла з каронай. Геаметрычны і ромба-геаметрычны арнаменты з'яўляюцца адной з галоўных прыкмет беларускага тэкстыльнага канону [4, с. 109–112]. Геаметрычная арнаментацыя ўзыходзіць да старажытных традыцый родаплемянных саюзаў рассялення ўсходніх славян, якія пражывалі на тэрыторыі Палесся, а ромба-геаметрычныя арнаменты ўбудаваны ў структуру тэкстыльнага канону менавіта ў аграрных культурах усходніх славян (дрыгавічоў і драўлян), што абумоўлівае агульнасць арнаментальнай традыцыі на беларуска-ўкраінскім памежжы. Гэта сведчыць аб агульнасці этнагенетычных каранёў традыцыйнай культуры рэгіёна Палессе. Каляровае вырашэнне закладных ручнікоў абмежаванае бела-чырвона-чорным спалучэннем, пры гэтым маса чырвонага колеру заўсёды больш значная, а белы і чорны колеры мелі рытмічнае паўтарэнне. Перавага белага колеру ўзмацняла графічную актыўнасць арнаменту, ці наадварот пры суцэльным чырвоным, губляліся белыя тонкія прабелы, што рабіла ручнік манументальна выразным. Чорны колер быў дадатковым і графічна вылучаў асобныя элементы арнаменту. Выкарыстоўвалася льняная або баваўняная пража: «горынь», «запалач», «заболоть», «забалаць» (бел.); «лучка», «горіна», «горинь», «заполоч» (укр.). У закладным ткацтве ўжывалася два ці большая колькасць рознакаляровых уткоў, кожным з якіх тчэцца пэўная частка ўзору. У месцах стыку ўткоў рознага колеру ўтворыцца прасвет, так як тут яны не перакрываюць агульныя ніткі асновы. Усе канцы нітак утка закладваліся ў парадку чарговасці. Перапляценне было палатнянае, чым і тлумачылася гладкая фактура тканіны. Такія палотны мелі аднолькавы ўзор на твар і на выварат і характэрныя зазоры паміж вертыкальнымі ўступамі ўзору. Закладное ткацтва дазваляе атрымліваць геаметрычны арнамент сапрыступкавымі контурамі ўзору, у сувязі з чым трохкутныя, рамбічныя, крыжападобныя фігуры і іх спалучэнне набывалі фантастычныя формы. На беларуска-ўкраінскім памежжы сустракаліся ручнікі, дзе ўзоры закладнога ткацтва перамяжоўваліся з нешырокімі гладкімі чырвонымі палосамі, а часам – з арнаментальнымі бардзюрамі, выкананымі ў тэхніцы бранага або пераборнага ткацтва. Канцы ручнікоў часта ўпрыгожвалі вязанымі або плеценымі карункамі.

Репозиторий ВГУ

Такім чынам, на беларуска-ўкраінскім памежжы ў канцы XIX – першай палове XX ст., у гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Усходняга Палесся Беларусі і Сярэднім Палессі Украіны, сфарміраваўся арыгінальны тып ручнікоў у тэхніцы закладнога ткацтва («завеска»), які робіць уражанне фрагмента ўзорнага дывана. Выяўлена агульнасць мастацкага канону палескіх закладных ручнікоў у іх кампазіцыі, значнасці метрычных характарыстык, асартыменце арнаментаў і мастацка-дэкаратыўных матываў, трыядзе бела-чырвона-чорнага каляровага рашэння, тэхналагічным прыёме іх вырабу. Распаўсюджванню закладной тэхнікі ткацтва і фарміраванню агульнага асартыменту арнаментальных матываў на ручніковых палотнах спрыялі ўплыў традыцый усходніх качавых народаў на тэрыторыі Беларусі і Украіны, кантакты Кіеўскай Русі з Візантыяй, экспарт кілімаў з Усходу, распаўсюджванне казацкіх культурных традыцый, уплыў з канца XVII ст. на народнае ткацтва вытворчасці мануфактур і саматужнай прамысловасці на беларуска-ўкраінскім памежжы. У цэлым агульныя мастацкія традыцыі афармлення гэтых ручнікоў абумоўлены этнакультурным узаемадзеяннем беларусаў і ўкраінцаў. Назвы ручнікоў паказваюць на лакальнае багацце дыялектнай культуры Палесся. Гэтая праблема патрабуе больш глыбокага вывучэння і з'яўляецца актуальнай для аб'ектыўнага асвятлення этнічнай культуры беларуска-ўкраінскага памежжа.

*Літаратура*

1. Булгакова, Л.Поліський рушник XX ст. // Полісся України: матеріали історико-етнографічного дослідження / За ред. С. Павлюка, М. Глушка. – Львів: Інститут народознавства НАН України, 1999. Вип. 2 Овруччина. 1995. – С. 329–364.

2. Голоса ушедших деревень / Г.Г. Нечаева [и др.]; под общ. ред. Г.Г. Нечаевой, фото Д.В. Галкина, П.Н. Анансона. – Минск: Белорус. наука, 2008. – 342 с.

3. Захарчук-Чугай, Р. Народне декоративнее мистецтво // Полісся України: матеріали історико-етнографічного дослідження / За ред. С. Павлюка, М. Глушка. – Львів: Інститут народознавства НАН України, 1999. Вип. 2 Овруччина. – 1995. – С. 293–328.

4. Лобачевская, О. Белорусский народный текстиль: художественные основы, взаимосвязи, новации / О.А. Лобачевская. – Минск: Беларуская навука, 2013. – 530 с.

5. Орел, Л. Українське Полісся. Те, що не забувається / Л.Г. Орел. – Київ: Наш час, 2010. – 271 с.

6. Сидорович, С. Художня тканина західних областей УРСР: [монографія] / С. Сидорович; АН УРСР, Музей етнографії та худож. промислу. – Київ: Наук. думка, 1979. – 153 с.



Репозиторий ВГУ